УДК 372.881

# ІНАВАЦЫЙНЫЯ ТЭХНАЛОГІІ Ў ВЫКЛАДАННІ БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ Ў СЯРЭДНЯЙ ШКОЛЕ

**Пракопчык Ірына Аляксееўна**
настаўнік беларускай мовы і літаратуры першай катэгорыі
дзяржаўнай установы адукацыі "Сярэдняя школа № 4 г. Асіповічы"
(г. Асіповічы, Беларусь)
irina.prokopchik.78@mail.ru

*У артыкуле разглядаюцца асобныя прыёмы інавацыйных тэхналогій, якія выкарыстоўваюцца на ўроках беларускай літаратуры. Адзначаецца, што выкарыстанне гэтых прыёмаў на розных этапах урока дапамагае зрабіць яго эфектыўным, рэзультатыўным, а працэс атрымання ведаў для вучняў – цікавым і прадуктыўным.*

Сёння не павінна быць такога настаўніка, які не задумваўся б над пытаннямі: "Як зрабіць урок цікавым?", "Як павысіць матывацыю да навучання?", "Як стварыць сітуацыю поспеху для кожнага вучня?" У сваёй настаўніцкай дзейнасці прытрымліваюся такога правіла: "Складанае ператварыць у займальнае, дапамагчы вучню стаць паспяховым".

Выкарыстанне інавацыйных тэхналогій на ўроках літаратуры павышае актыўнасць вучняў, развівае навыкі самастойнага атрымання ведаў у працэсе ўзаемадзеяння і пошуку. Павышаецца якасць і трываласць атрыманых ведаў, развіваюцца даследчыя навыкі і ўменні, фарміруюцца аналітычныя здольнасці вучняў. Паралельна з працэсам навучання



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

развіваюцца камунікатыўныя якасці і фарміруюцца лідарскія якасці асобы.

Пры выкарыстанні інавацыйных тэхналогій у навучанні беларускай літаратуры паспяхова прымяняю на сваіх уроках наступныя прыёмы: “Асацыяцыі”, “Алфавіт”, “Алітарацыя”, “Сінквейн”, “Дыяманта”, “Кластар”, “Камплімент”, “Люстэрка”, “Завяршы фразу”, “Ключавое слова”, “Памяняемся месцамі”, “Падбяры пару”, “Параўнай”, “1+2+4”, “Групавая дыскусія”, “Эстафета”, “Апорны канспект”, “Мазгавы штурм”, “Праца з тэстамі”, “Даследчая работа”, “Заданні пошукавага характару”, “Нетрадыцыйныя формы дамашняга задання”, “Веру-не веру”, “Лагічны ланцужок”, “Тонкія і тоўстыя пытанні”, “Чытанне з алоўкам”, “Праца з тэкстам”.

Падрабязней раскажу толькі пра некаторыя з іх.

Вельмі часта выкарыстоўваю на сваіх уроках прыёмы *“Сінквейн”* і *“Дыяманта”* як прыёмы тэхналогіі развіцця крытычнага мыслення на стадыі рэфлексіі. Аднак сінквейн можа выкарыстоўвацца на розных этапах урока: пры паўтарэнні – сціслае паведамленне, пры асэнсаванні – удумлівая праца над новымі паняццямі, пры рэфлексіі – гэта сродак творчага выражэння асэнсаванага матэрыялу. Дыяманту пачынаю прымяняць з 8-га класа. Напісанне дыяманты карысна для разумення вучнямі сутнасці адрозненняў і ўзаемасувязі паняццяў, супрацьлеглых па значэнні.

*Прыём “Кластар”* дазваляе графічна адлюстраваць мысленчыя працэсы на ўроку: у цэнтры ліста, дошкі запісваецца асноўнае слова, а вакол яго пішуцца словы-асацыяцыі. Неабходна скласці як мага болей сувязей паміж усімі элементамі. Пры гэтым нельга баяцца выказваць любыя ідэі і даваць волю ўяўленню. Кластар з’яўляецца наглядным мысленчым полем вакол адной ідэі ці персанажа і дае больш магчымасцей для аналізу тэмы. Напрыклад, пры вывучэнні рамана К. Чорнага “Пошукі будучыні” ў 10 класе прапанавала намаляваць кластар “Героі рамана “Пошукі будучыні”. На кластары вучні адлюстравалі сувязі паміж персанажамі, паказалі галоўных і другасных персанажаў, адзначылі асноўныя падзеі рамана, тым самым даказалі, што сюжэт мае разгалінаваную будову.

*Такія прыёмы як “Чытанне з алоўкам” і “Праца з тэкстам”* прымяняю на аперацыйна-навучальным і кантрольна-карэкцыйным этапах урока. Настаўнік загадзя працуе з тэкстам і выбірае эпізоды, дзе трэба зрабіць паўзы і адказаць на пытанні, якія прымушаюць унікаць у прачытанае і выказваць меркаванні, заснаваныя на асабістых уражаннях ад твора. Працуючы з тэкстам, вучні фармулююць тэму, ідэю мастацкага твора, знаёмяцца са сродкамі мастацкай выразнасці, вызначаюць кампазіцыю, рыфму і памер.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Пры выкарыстанні прыёму *“1+2+4”* рашэнне праблемы спачатку адбываецца індывідуальна, потым у парах і, нарэшце, у творчых групах. Напрыклад, у час аналізу апавядання В. Адамчыка “Салодкія яблыкі” ў 6 класе трэба вырашыць праблемнае пытанне: “Чаму твор называецца “Салодкія яблыкі”, хоць набегу хлопчыкаў, у тым ліку і Тоніка, на сад адведзена ўсяго два абзацы?” Кожны вучань спачатку спрабуе даць адказ індывідуальна. Пасля аналіз твора працягваецца, робяцца пэўныя вывады. Зноў прапануецца адказаць на пытанні, загадзя абмеркаваўшы іх ў парах. Як паказвае практыка, вучні не зусім яшчэ разумеюць гэтай праблемы. І толькі пасля таго, як творчыя групы папрацавалі і прыйшлі з дапамогай настаўніка да пэўных вывадаў, фармулюецца адпаведнае вырашэнне праблемы. Гэты прыём, дарэчы, будзе выкарыстаць пры праблемным аналізе верша П. Панчанкі “Сармацкае кадзіла” ў 6 класе. Пытанні могуць быць такога зместу: “Што, на ваш погляд, прымусіла П. Панчанку ўзяцца за пяро і напісаць верш?”, “Да чаго ў будучыні можа прывесці бяздумная дзейнасць чалавека?”, “Што трэба рабіць, каб не загінула наша прыродная спадчына?”

Вельмі дзейсны прыём *“Асацыяцыі”* на арганізацыйна-аперацыйным этапе. Гэты прыём дае магчымасць стварыць патрэбную атмасферу на ўроку, вызначыць яго тэму, развіць уяўленне, інтуіцыю, выказаць прапановы аб змесце мастацкага твора, абмеркаваць назву. Напрыклад, пры вывучэнні твораў пра прыроду асацыяцыі падбіраем да слоў “лета”, “восень”, “зіма”, “вясна”, “радзіма”, “край”, “Беларусь”; пры разглядзе твораў пра вайну – “вайна”, “мір”, “вораг”, “салдат”, “перамога”, “незалежнасць”; пры аналізе апавяданняў пра сяброўства – “дружба”, “сябар”, “прыяцель” і інш.

На кантрольна-карэкцыйным этапе часта карыстаюся прыёмам *“Падбяры пару”*. Напрыклад, у 5 класе пры вывучэнні тэмы “Прыказкі” вучні павінны злучыць беларускую прыказку з рускай:

| Беларускія прыказкі | Рускія прыказкі |
|---|---|
| 1. Калі ўлез у дугу, не кажы: не магу. | А. В тихом омуте черти водятся. |
| 2. У ціхім балоце чэрці растуць. | Б. Труд кормит, а лень портит. |
| 3. Цікаўнай Амілі нос прышчамілі. | В. Взялся за гуж – не говори, что не дюж. |
| 4. Не будзь ласы на чужыя каўбасы. | Г. Любопытной Варваре на базаре нос оторвали. |
| 5. Скончыў работу – гуляй у ахвоту. | Д. Сделал дело – гуляй смело. |
| 6. Дзе шчырая праца – там густа, а дзе лянота – там пуста. | Е. На чужой каравай рот не разевай. |
| 7. Чалавек без сяброў, што печ без дроў. | Ё. Не имей сто рублей, а имей сто друзей. |

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

У 9 класе пры вывучэнні паэмы Я. Коласа “Новая зямля” вучні павінны вызначыць выяву, якая адпавядае вылучанаму слову:

| | |
|---|---|
| **1.** Памалу, мерна крок за крокам<br>Ў сваім раздум’і адзінокім<br>Дадыбаў бацька скора к дому.<br>Зачуўшы татаў ход знаёмы,<br>Малыя з хаты высыпалі,<br>За **БРАМАЙ** бацьку сустракалі. |  |

Вялікае значэнне для раскрыцця творчага патэнцыялу вучня мае прыём *“Нетрадыцыйнае дамашняе заданне”*. У сваёй практыцы выкарыстоўваю такія *формы*: складанне апавядання па прыказцы; прыдумванне загадак, працягу апавядання; падрыхтоўка ілюстрацый, афіш, вусных замалёвак; мастацкае чытанне пад музыку; інсцэніроўка; падбор матэрыялу да заліку па тэме; прэзентацыі; складанне апорных табліц, крыжаванак; стварэнне буктрэйлераў да твораў, слоўніка эмоцый; пошук інфармацыі на самы рэдкі факт пра жыццё і творчасць пісьменніка; прагляд відэаматэрыялаў і супастаўленне з пісьмовымі крыніцамі. Такія дамашнія заданні дапамагаюць пазбягаць аднастайнасці ў навучанні. Вучань можа адчуць сябе і ў якасці аўтара, і ў якасці ілюстратара, і ў якасці настаўніка. Нетрадыцыйныя заданні актывізуюць мысленне, уменне вучня абагульняць, сістэматызаваць матэрыял па тэме.

Развіццю пазнавальнай актыўнасці спрыяюць і *нетрадыцыйныя ўрокі,* якія дазваляюць павысіць матывацыю да навучання. Існуе некалькі класіфікацый нестандартных урокаў і мноства іх відаў: урок-лекцыя, урок-гутарка, урок-практыкум, урок-семінар, урок-даследаванне, урок-канферэнцыя, урок-экскурсія, урок-падарожжа, урок-гульня, урок-абарона праекта, урок-тэатралізаванае прадстаўленне, урок-дыспут, урок-залік. Практычна ўсе яны дазваляюць задаваць праблемныя пытанні і ствараць праблемныя сітуацыі, рашаць задачы дыферэнцыраванага навучання, актывізуюць вучэбную дзейнасць, павышаюць пазнавальную цікавасць, садзейнічаюць развіццю крытычнага мыслення. У якасці прыкладу хачу прывесці фрагмент урока-заліку ў 9 класе па паэме Я. Коласа “Новая зямля”:

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

| Прозвішча, імя вучня | |
|---|---|
| 1. Крыжаванка<br> | Па вертыкалі:<br>1. Якое слова найчасцей ужываюць, калі гавораць пра адлюстраванне ў паэме Якуба Коласа “Новая зямля” жыцця беларускага сялянства?<br>Па гарызанталі:<br>1. Назва раздзела паэмы.<br>2. Адзін з галоўных герояў твора.<br>3. Хто ў сям’і кожны дзень хадзіў на службу?<br>4. Яна – не толькі фон, на якім разгортваецца дзеянне, але сродак для характарыстыкі вобразаў-персанажаў.<br>5. Якую стравуварыў дзядзька-кухар дзецям?<br>6. Што марыў набыць Міхал, каб “выпутацца з панскіх пут”?<br>7. Як звалі жонку Міхала?<br>8. Што прыносіць дзядзьку Антосю радасць і асалоду?<br>9. Свята, якое апісана ў паэме.<br>10. Каго вывеў Якуб Колас на гістарычную сцэну?<br>11. Хто з персанажаў твора адпавядае гэтым радкам: “І праўда, пан быў злы, паганы // І звераваты, надзіманы, // І мух нямала меў у носе…”?<br>12. Як называўся горад, дзе дзядзька Антось шукаў зямельны банк? |
| 2. Растлумачце назву раздзела II “Раніца ў нядзельку”. | |
| 3. Задайце два пытанні да раздзела. | |
| 4. Растлумачце значэнне выдзеленага слова:<br>Стаяў асобна ў місцы скорам<br>Сяго-таго для *верашчакі*. | |



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Вучням цікава дзейнічаць, актыўна ўдзельнічаць на працягу ўсяго ўрока, памыляцца і шукаць прычыны памылак, фармуляваць пытанні, а не толькі на іх адказваць, а гэта значыць, ім хочацца займаць актыўную камунікатыўную пазіцыю. Задача настаўніка – дапамагчы вучню накіраваць яго вучэбную дзейнасць у творчасць. Прымяненне інавацыйных тэхналогій на розных этапах урока дапамагае зрабіць яго эфектыўным, рэзультатыўным, а працэс атрымання ведаў для вучняў – цікавым і прадуктыўным.

**Спіс літаратуры**

1. Жуковіч, М. В. Дыдактычныя мадэлі ўрокаў па тэхналогіі развіцця крытычнага мыслення / М. В. Жуковіч // Беларус. мова і літ. – 2012. – № 12. – С. 26–28.

2. Кашлев, С. С. Интерактивные методы обучения педагогике / С. С. Кашлев. – Минск : Вышэйш. шк., 2004. – 176 с.

3. Паляшчук, А. А. Фарміраванне вобразных уяўленняў вучняў на ўроках беларускай літаратуры сродкамі візуалізацыі / А. А. Паляшчук // Беларус. мова і літ. – 2018. – № 7. – С. 48–49.

4. Руцкая, А. В. Умовы эфектыўнасці літаратурнага навучання / А. В. Руцкая // Беларус. мова і літ. – 2008. – № 12. – С. 15–17.

5. Шамякіна, Т. І. Якім быць уроку беларускай літаратуры / Т. І. Шамякіна // Беларус. мова і літ. – 2008. – № 12. – С. 6–7.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова